ПРАЕКТ «ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ»

# Вароты на Вялікую зямлю

**У снежні 1943 года загадам штаба партызанскага злучэння Мінскай вобласці была створана партызанская брыгада №258 – апошняя з тых, што дзейнічалі на тэрыторыі Любаншчыны. Брыгада атрымала імя Валерыяна Куйбышава.**

У яе ўваходзілі атрады імя Васіля Чапаева, імя Андрэя Труцікава і імя Сямёна Будзённага, створаныя з ліку жыхароў в. Рэдкавічы і іншых населеных пунктаў Любаншчыны. Узначаліў брыгаду Георгій Сталяроў. Той самы Жорка (так па-простаму звалі яго баявыя таварышы), які ў снежні 1941 г. стаў камандзірам аднаго з першых партызанскіх атрадаў у нашым раёне. Камісарам брыгады прызначылі Віталя Смірнова, а начальнікам штаба – Васіля Волгава (яго ў маі 1944 г. змяніў Віктар Дунаеў).

Але і лістапад 1943 г. быў насычаны не менш значнымі падзеямі. У выніку Гомельска-Рэчыцкай аперацыі, што праводзіў Беларускі фронт пад камандаваннем генерала арміі Канстанціна Ракасоўскага, была не толькі вызвалена ад захопнікаў частка тэрыторыі рэспублікі. Войскі 65-й арміі гэтага фронту, якую ўзначальваў генерал-лейтэнант Павел Батаў, ступілі на тэрыторыю Любанска-Акцябрскай партызанскай зоны.

**Баявыя дзеянні часцей арміі і Акцябрскай №123 імя 25-годдзя БССР брыгады народных мсціўцаў Фёдара Паўлоўскага ўтварылі брэш у абароне гітлераўскай групы армій «Цэнтр» шырынёй каля дзесяці кіламетраў паміж населенымі пунктамі Парычы і Азарычы. Гэтая брэш увайшла ў гісторыю як «Рудабельскія вароты».**

Чырвоная Армія і партызаны ўтрымлівалі іх амаль месяц.

Яшчэ ў канцы верасня 1943 г. ва ўсе падпольныя абкамы Беларусі быў перададзены па радыё тэкст звароту Прэзідыума Вярхоўнага Савета, Цэнтральнага камітэта кампартыі і Саўнаркама рэспублікі да беларусаў. «Настаў час поўнага вызвалення роднай Беларусі і ўсяго беларускага народа ад іга захопнікаў», – гаварылася ў звароце. У дачыненні ж канкрэтна да партызанаў у дакуменце падкрэслівалася: «Пры прыбліжэнні часцей Чырвонай Арміі ўстанаўлівайце з імі сувязь, актыўна ўзаемадзейнічайце, асабліва пры захопе населеных пунктаў, пераправаў. Памагайце Чырвонай Арміі аднаўляць масты, пераправы і дарожную маёмасць».

І тут вам дзесяць кіламетраў разрыву лініі фронту! Дзякуючы гэтаму паміж злучэннем народных мсціўцаў Мінскай вобласці і армейскім камандаваннем былі наладжаны не толькі сувязь, але і прамыя зносіны. «Рудабельскія вароты» былі выкарыстаны армейскімі разведгрупамі. У Любанска-Акцябрскай зоне пабываў нават начальнік разведкі артылерыі 48-й стралковай дывізіі, што ўваходзіла ў склад 65-й арміі, Барыс Рэзнікаў. Ён правёў нараду з камандзірамі партызанскіх атрадаў і паліторганамі. Група афіцэраў Чырвонай Арміі дзесяць дзён гасціла сярод партызанаў – палітработнікі праводзілі мітынгі і сустрэчы з мясцовым насельніцтвам.



Аляксей Аркадзьевіч МЯДЗВЕДЗЕЎ, камандзір атрада імя Будзённага.



Максім Гаўрылавіч СЕМЯНЕНЯ, камісар атрада імя Будзённага.



Васіль Сцяпанавіч СТАТКЕВІЧ, камандзір атрада імя Труцікава.



У першым радзе другі злева Анатоль Леанідавіч НІКІЦІН, камандзір атрада «Жалязняк», сярод афіцэраў Чырвонай Арміі – другі справа ў першым радзе Барыс Рыгоравіч РЭЗНІКАЎ, начальнік разведкі артылерыі 48-й стралковай дывізіі, якая ўваходзіла ў склад 65-й арміі.

У гэты час Ваенны савет 65-й арміі заслухаў і абмеркаваў даклад прадстаўніка партызанскага злучэння Міншчыны аб абстаноўцы ў тыле праціўніка перад фронтам Арміі. На савеце былі зацверджаны планы баявых дзеянняў партызанскіх брыгад па зрыву перавозак ворага на чыгунках Лунінец–Калінкавічы, Асіповічы–Слуцк і Бабруйск–Мінск, актывізацыі баявой дзейнасці на шашэйных дарогах, правядзенні разведкі размяшчэння варожых часцей.

У снежні 1943 г., выконваючы пастаўленую задачу, народныя мсціўцы Мінска-Палескага злучэння вывелі са строю ракадную чыгунку Бабруйск–Старушкі на даўжыню каля ста кіламетраў. Немцам спатрэбілася шмат намаганняў, каб аднавіць яе.

Па просьбе сакратара Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б Васіля Казлова Ваенны савет 65-й арміі аказаў дапамогу партызанскім фарміраванням злучэння зброяй – народныя мсціўцы атрымалі пяцьсот вінтовак, дзве сотні аўтаматаў, сотню супрацьтанкавых ружжаў, паўтара мільёна патронаў, па пяць боекамплектаў мін да кожнага мінамёта, дваццаць тон узрыўчаткі, узрывацелі і іншы ваенны рыштунак. Трыццаць пяць аўтамашын даставілі ўсё гэта на спецыяльную базу ў раён вёскі Гамза, адкуль у савецкі тыл былі эвакуіраваны цяжкапараненыя і хворыя партызаны.

У сваю чаргу Ваенны савет звярнуўся да камандавання Мінскага партызанскага злучэння з просьбай накіраваць у 65-ю армію дзесяць тысяч чалавек папаўнення. Любанскі РК КП(б)Б правёў мабілізацыю сярод рэзерву народных мсціўцаў у населеных пунктах і 21 снежня 1943 г., як піша ў дзённіку камандзір партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі Аляксандр Далідовіч, накіраваў у рады Чырвонай Арміі каля тысячы чалавек.

Дарэчы, пасылалі не толькі папаўненне. 15 снежня партызаны сфарміравалі самавіты абоз і адправілі за лінію фронту для Чырвонай Арміі чатырыста пудоў мукі, тузін свіней і трыццаць авечак (пра тое зноў жа паведамляе дзённікавы запіс). У ліку тых, хто суправаджаў гэты абоз, быў і адзін з членаў камсамольска-маладзёжнай падпольнай групы ў Любані Уладзімір Раменчык. На жаль, у адной з сутычак з ворагам, якія здараліся падчас шляху, хлопец загінуў.

**Праз «Рудабельскія вароты» на Вялікую зямлю перадавалі сродкі: грошы і іншыя каштоўнасці, сабраныя насельніцтвам яшчэ акупаваных ворагам раёнаў на ўмацаванне ваеннай магутнасці Чырвонай Арміі. Скажам, на будаўніцтва танкавай калоны «Беларускі партызан». Горача адгукнуліся на такі збор і жыхары Любаншчыны.**

Адзначаючы ўмацаванне кантактаў народных мсціўцаў з савецкімі войскамі, былы гітлераўскі генерал Рэндуліч пісаў: «Ні на адным іншым тэатры ваенных дзеянняў не было такога цеснага ўзаемадзеяння паміж партызанамі і дзеючай арміяй, як на рускім. Бывалі выпадкі, калі ва ўзаемадзеянне з часцямі Чырвонай Арміі ўступалі сілы партызанаў, якія налічвалі да дзесяці тысяч чалавек».

Увогуле ж на працягу лістапада-снежня 1943 г. народныя мсціўцы ні на дзень не спынялі сваю баявую дзейнасць. У дакладной запісцы камандавання Мінскага партызанскага злучэння сакратару ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнку паведамляецца, што за згаданы час брыгада №64 імя В.П. Чкалава падарвала дзевяць эшалонаў праціўніка, 78 аўтамашын, дзевяць мастоў, збіла адзін самалёт. А таксама разграміла варожыя гарнізоны ў вёсках Макарычы Старадарожскага раёна і Белічы Слуцкага раёна (тылы 102-й нямецкай арміі). У Белічах, дарэчы, было забіта 38 нямецкіх салдат і афіцэраў. Узята трафеяў: 18 вінтовак, два ручныя кулямёты, шэсць павозак, дванаццаць коней з сёдламі і больш за шэсць тысяч патронаў.

У справаздачы камандавання партызанскай брыгады №100 імя С.М. Кірава Мінскаму абкаму КП(б)Б паведамляецца, што брыгада ў лістападзе-снежні два разы вяла бой у вёсцы Пасека Старадарожскага раёна, адзін бой у вёсках Касцяшы і Зялёнкі, адзін бой у вёсцы Прусы, у якіх было забіта чвэрць сотні нямецкіх салдат і афіцэраў.

Пра дзеянні партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі расказвае дзённік яе камандзіра:

«6 лістапада 1943, субота. Група з атрада Фурмана, якая здзейсніла дыверсію на дарозе Урэчча–Таль, арганізавала на гэтай жа дарозе засаду. Знішчана 25 гітлераўцаў. На дарозе Пагост–Слуцк падрыўнікі атрада Плышэўскага паставілі міну, на якой падарвалася легкавая аўтамашына. Забіты тры афіцэры і шафёр. Падрыўнікі атрада Шаўцова падарвалі нямецкую аўтамашыну на дарозе Любань–Урэчча. У выніку ўзрыву машына разбіта, забіта пяць і паранена тры немцы.

15 лістапада 1943, панядзелак. Пры ўзрыве магнітнай міны на станцыі Брынёва, падкладзенай пад апламбіраваны вагон падрыўнікамі атрада Качанава, у паветра ўзляцелі тры вагоны з боепрыпасамі.

17 лістапада 1943, серада. Партызаны атрада Плышэўскага ў раёне Урэчча падарвалі нямецкую грузавую аўтамашыну. Забіта пяць немцаў. Падрыўнікі атрада Фурмана на ўчастку чыгункі Жыткавічы–Мікашэвічы пусцілі пад адхон нямецкі воінскі эшалон з жывой сілай, які ішоў з фронту. Выведзены са строю паравоз, разбіта тры і пашкоджана чатыры вагоны, забіта і паранена да 120 гітлераўцаў».

І гэтак амаль кожны дзень.

У канцы снежня 1943 г. фашыстам удалося зачыніць «Рудабельскія вароты». Пару палкоў 65-й арміі трапілі ў варожае акружэнне і таксама перайшлі да партызанскіх дзеянняў, натварыўшы шмат шуму ў тылах нямецкай групы армій «Цэнтр». Пасля паспяхова прарваліся да сваіх.

Да вызвалення Любаншчыны заставалася яшчэ паўгода...

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**